УДК 821. 161.3.09 + 821.162.1.09

**В.І. Еўмянькоў** *(г. Магілёў, Беларусь)*

# ФЕНОМЕН КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў ПОЛЬСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ ПРАСТОРЫ XVIII – XIX стст.

Разважаючы пра Царкву і Касцёл, адзін з сучасных беларускіх філосафаў В. Акудовіч ("Код адсутнасці") адзначае: "У Расіі Царква ніколі не працавала непасрэдна на ідэю Рэлігіі. Наперадзе заўсёды былі альбо патрэбы Дзяржавы, альбо Нацыі <...>. Інакш сітуацыя складвалася ў Польшчы. Надоўга пазбаўленая дзяржаўнасці, польская нацыя абапіралася на Касцёл і гуртавалася Касцёлам. У выпадку з Польшчай уяўляе цікавасць той факт, што нават у адсутнасці дзяржавы, Нацыя можа ператварыць Рэлігію ў магутны сродак свайго фармавання" [1, с. 16, 17]. Не маючы на мэце ні абвергнуць, ні сцвердзіць выснову адносна праваслаўнай Царквы, засяродзімся на Касцёле. Пагаджаючыся з В. Акудовічам, праяснім усё ж некалькі важных момантаў. Па-першае, як і чаму менавіта каталіцызм станавіўся грунтам польскай нацыянальнай ідэі. Па-другое, што з гэтай ідэі атрымалі ў спадчыну беларусы?

Перш, чым адказаць на пытанні "як" і "чаму", трэба вырашыць "калі". Пры гэтым трэба мець на ўвазе час фармавання польскай нацыі – у перыяд з прыняцця Канстытуцыі 3 мая (1791) і недзе да 1840-х гг. Аднак польскасць і каталіцкасць паядналіся раней. Калі? Відавочна, што не ў X ст., калі Мешка І разам з дружынаю прыняў хрысціянства, і нават не ў XIII, калі нарадзіўся першы і праз шматлікія наследаванні самы вядомы рэлігійны гімн палякаў "Bogurodzica". І наўрад ці каталіцызм мог зрабіцца "вераю польскай" у перыяд Адраджэння, калі пры дварах спачатку Жыгімонта Старога, а потым і Жыгімонта ІІ Аўгуста, без перабольшвання, квітнеў пратэстантызм. Сітуацыя карэнным чынам змянілася толькі пры Жыгімонце ІІІ Вазе (кароль з 1587), пра якога паведамляе адзін з "самых польскіх" аўтараў XIX ст. Генрык Жавускі ("Pamiątki Soplicy"). "Zygmunt, – заўважае ён, – tyle usilności łożył, aby wiarę polską zaszczepić w Rusi". Выхаваны езуітамі, кароль-фанатык імкнуўся навязаць каталіцызм украінцам, "tym krokiem Kozactwo od nas się oderwało: to była pierwsza przyczyna upadku ojczyzny" [2, s. 29].

Заўважым тое, што ў дадзеным артыкуле нас цікавяць не адмоўныя вынікі акаталічвання, а яго прычыны (а дакладней тое, як іх тлумачыць Г. Жавускі). Працытуем "Pamiątki...": "Państwa na ruskich kniaziach zdobyte w ogromie swoim o dwa razy przynajmniej przewyższały Polskę. W nich nic polskiego nie było – religia, język, obyczaje, prawodawstwo, wszystko było obce i nieprzyjazne. Zygmunt III poznał, że skoro naród podbity myślą się nie skojarzy z narodem podbójczym, ani chwili nie przestanie być z nim w wojnie. On poznał, że w stosunku z Moskwą nasza narodowość jedynie na religii katolickiej się opiera. <...> jak



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

religia nasza te kraje ogarnęła wszystkie, inne warunki polskiego żywota same z siebie tam się wkorzeniły" [2, s. 30].

З дадзенай цытаты вынікае тое, што на пачатку XVII ст. Касцёл зрабіўся правадніком "польскасці" на ўсход, пры гэтым каталіцызм быў выкарыстаны ў ідэалагічнай вайне з Масквой – як супрацьвага праваслаўю і як дзейсны сродак аб'яднання славян вакол пэўнага палітычнага цэнтра (у дадзеным выпадку Рэчы Паспалітай).

Парадокс аднак у тым, што польскасці, як нацыянальнага паняцця ў XVII ст. і блізка не існавала. Г. Жавускі, а ён пісаў свае "Pamiątki" ў 1830-я гг., калі нацыя амаль склалася, правільна заўважыў гістарычную тэндэнцыю атаясамліваць пальшчызну з каталіцызмам (асабліва тут, на "крэсах всходнех"), аднак пры азначэнні пальшчызны карыстаўся катэгорыямі XIX ст., якія ніяк не стасаваліся з рэаліямі стагоддзя XVII. Пісьменнік, як бы выказаўся В. Акудовіч, прымусіў сярэдневяковага рыцара-сармата карыстацца сістэмай сучасных дарожных знакаў. І ў сувязі з гэтай недарэчнасцю яшчэ раз працытуем Г. Жавускага: "wszystkie, inne warunki polskiego żywota same z siebie tam się wkorzeniły". Якія "праявы польскага жыцця" маюцца на ўвазе? Пісьменнік пэўна не ведаў пра тое, што яго продкі-сарматы аддавалі дзяцей "вадою польскаю абмыцца" ў езуіцкія калегіумы, у якіх і знаку польскасці не было, бо ў маўленні, навуцы панавала лаціна. Апошняя не саступіла ніводнай са славянскай моў ні ў касцёле, ні ў дзяржаўным справаводстве, і да сэрэдзіны XVIII ст. літаральна "забіла" польскую нацыянальную літаратуру.

Іншымі словамі, мы пагаджаемся з тым, што Касцёл быў мастом, па якому польскасць перайшла на "рускія" / праваслаўныя землі і запанавала на іх. Аднак мы не згодны з тым, што яе трэба атаясамліваць з сучасным нацыянальным паняццем. Пры гэтым засноўваемся на тэзісе, які ўжо не трэба, як нам думаецца, даказваць: у згаданыя стагоддзі паляк – не этнонім, а палітонім (як і літвін). Па гэтай прычыне пашырэнне каталіцтва на ўсход спрыяла пашырэнню не нацыянальных (пэўных этнічных) ідэй, а палітычных. Якіх?

Дзеля таго, каб адказаць на гэта пытанне звернемся да аднаго з бацькоў польскай культуры (беларуса, паводле нацыянальнасці) Адама Міцкевіча. У "Кнігах народа польскага" ён выказаўся наступным чынам: польскасць – ідэя не нацыянальная, а універсальная (агульначалавечая), бо захоўвае ў сабе дух свабоды, які паходзіць ад духа Божага. Паляк, паводле А. Міцкевіча, – чалавек Божы, г.зн. "свабодны чалавек". Што значыць дадзеная выснова ў кантэксце нашага даследавання? Па-першае, яшчэ раз адзначым тое, што Рэч Паспалітая не ўспрымалася нават у сярэдзіне XIX ст. (і не толькі А.Міцкевічам) як дзяржава, пабудаваная выключна па нацыянальнаму прынцыпу; па-другое, ідэя свабоды ў Еўропе, на захадзе і ўсходзе якой панавала абсалютысцкая манархія, была перадусім ідэяй палітычнай. Невыпадкова А.Міцкевіч запрашае еўрапейцаў прыняць "польскі хрост" ("Dziady"), г.зн. атрымаць свабоду.

Такім чынам, Касцёл ("вера польская") у XVII – XVIII ст. быў правадніком хрысціянскай ідэі асабістай свабоды, якая рэалізавалася ў палітычнай ідэалогіі сарматызму. Інакш кажучы – да 1795 г. (а нават і далёка пазней) быць палякам – значыла, па-першае, быць шляхціцам, па-другое, быць католікам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І ў першым, і ў другім выпадку польскасць не замінала "чалавеку паспалітаму" называць сябе літвінам / русінам з-пад Навагрудка або беларусцам з-пад Магілёва.

Аднак, чаму на пачатку XIX ст. Касцёл усё ж зрабіўся падмуркам цяпер ужо пэўнай нацыянальнай ідэі. Польская нацыя ў цяперашнім яе выглядзе пачала складвацца якраз у той момант, калі польскай дзяржавы ўжо (ці яшчэ?) не існавала. Трэба ўлічваць і тое, што нацыя была раскіданай ледзь не па ўсёй Еўропе, і фарміравалася не так паводле адзінства мовы і тэрыторыі, як паводле адзінства памкненняў: здабыццё свабоды. Гэта ідэя кансалідавала "палякаў" у 1812, 1831 і 1863 – 1864 гг. і сплавіла ў адну палітычную партыю чатыры народы былой Рэчы Паспалітай (у тым ліку і беларусаў). Пры гэтым роля Касцёла ў працэсе сплаўкі была надзвычайнай. Касцёл, які выводзіў ідэю свабоды з Боскага натхнення, аб'ядноўваў усіх, хто варожа ставіўся да тыраніі.

Калі абстрагавацца, магчыма, ад залішняй тут патэтыкі, то сэнс нашых разважанняў зводзіцца да наступных высноў: у XVII – XIX ст. ідэя свабоды атаясамлівалася з палітычнай ідэяй, а Касцёл па розных прычынах фарміраваў і пашыраў яе на ўсход. У працэсе фарміравання еўрапейскіх нацый шляхціцы-крэсавякі (беларусы) каталіцкага веравызнання, пераважная большасць якіх, за выключэннем дысідэнтаў, прымала ўдзел у вызваленчай барацьбе, пачалі атаясамлівацца з ідэяй польскай як нацыянальнай. Так адбылася сплаўка этнасаў у грамадзянскую супольнасць спачатку ідэальнай, а потым і рэальнай (у 1920-я гг.) Рэчы Паспалітай.

Што з усяго гэтага атрымалі беларусы? Апроч спадчынных ("польскіх") фобій і забабонаў, яшчэ і адзін прыкры міф, паводле якога нацыянальныя і канфесійныя паняцці часта зліваюцца, а каталіцкасць (і не толькі на побытавым узроўні) амаль аўтаматычна дапасоўваецца да польскасці (напрыклад, каталіцкія могілкі ў Магілёве маюць назву "польскія"). І ў сувязі з гэтым як не згадаць тое, што пераважная большасць дзеячоў, якія спрычыніліся да беларускага адраджэння, былі каталікамі (Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Міцкевіч, Я. Чачот і інш.).

**Літаратура**

1. Акудовіч, В. Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці / Валянцін Акудовіч. – Мінск: Логвінаў, 2007. – 196 с.
2. Rzewuski, H. Pamiątki Soplicy / H. Rzewuski. – Warszawa: Państw. Inst. wydawniczy, 1978. – 450 s.

лектронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешов